# Каштоўней скарбаў царскіх



## Маральна-выхаваўчыя погляды Сімяона Полацкага

Сімяон Полацкі (1629 — 1680), свецкае імя якога было Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітняновіч, нарадзіўся ў Полацку ў сям'і заможнага шляхціца. Потым хлапчука выхоўваў айчым, які і даў яму другое прозвішча — Пятроўскі. Атрымаўшы на радзіме пачатковую адукацыю, ён працягвае вучобу ў знакамітай Кіева-Магілянскай калегіі, а затым у Віленскай езуіцкай акадэміі. Уступае ва уніяцкі базыльянскі ордэн. Восем гадоў праводзіць Сімяон у Полацкім Багаяўленскім манастыры.

Таленавіты літаратар і педагог быў заўважаны рускім царом Аляксеем Міхайлавічам і запрошаны ў Маскву. Там Сімяон Полацкі арганізуе лацінскую школу пры Заіконаспаскім манастыры, а неўзабаве афіцыйна прызначаецца выхавальнікам і настаўнікам царскіх дзяцей. У Маскве наш суайчыннік займаецца шматбаковай грамадскай, рэлігійнай, навуковай, педагагічнай і літаратурнай дзейнасцю. Калі яму прадаставілася магчымасць адкрыць Верхнюю друкарню, першай падрыхтаванай да друку працай стаў "Букварь языка словенска сиречь начало учения детем, хотящым учитися чтению писаний". Гэта сведчыць аб тым, што пачатковай адукацыі Сімяон Полацкі надаваў асаблівую ўвагу.

Паводле тагачаснай традыцыі яго буквар, акрамя дыдактычна-навучальнага матэрыялу, утрымліваў шэраг павучанняў, малітваў, сентэнцый, якія мелі на мэце маральна-духоўнае развіццё дзяцей. І ў далейшай педагагічнай дзейнасці Сімяон плённа працаваў над маральна-выхаваўчай тэматыкай. Нягледзячы на тое што асноўны перыяд свядомага жыцця вучонага праходзіў у Маскве, яго творчы патэнцыял, філасофска-педагагічныя і сацыяльныя погляды грунтаваліся на айчынным падмурку і ў многім сінтэзавалі і абагульнялі падыходы беларускіх асветнікаў XVI — XVII стст. да пытанняў маральнага выхавання. Дапамагаючы людзям зразумець сэнс іх жыццёвага шляху на зямлі, Сімяон Полацкі сцвярджаў, што маральныя якасці чалавека значна каштоўней любых матэрыяльных скарбаў, нават царскіх.

Іераманах Сімяон не пагаджаўся з поглядамі сярэднявечча на зямны перыяд жыцця чалавека як на нешта другараднае, якое амаль не ўяўляе каштоўнасці. Адкрытую варожасць выклікалі ў іерархаў Маскоўскай царквы разважанні Сімяона аб зямным шчасці як мэце чалавечага жыцця. У адной са сваіх пропаведзяў ён пісаў: "Кого ради солнце день творит, луна со звездами тму нощную озаряет? Ради человека. Кого ради сокровища злата и серебра, и каменей честных в недрах земных, и бисеры драгия в пучинах водных соблюдаются? Человека для. Паче же и ангелы... человеку на службу Богом установишася".

Сімяон Полацкі спрабаваў распрацаваць адзіныя для ўсіх слаёў і класаў грамадства прынцыпы выхавання, што грунтаваліся б на маральных законах і нормах, якімі павінны карыстацца ў жыцці ўсе без выключэння людзі. Трэба адзначыць, што езуіты ператалумачвалі ў той час біблейскія запаветы такім чынам, што асобы, якія займаюць больш высокае становішча ў грамадстве, нібыта могуць карыстацца адпаведна і большымі правамі. У Сімяона Полацкага ж перад законамі маральнасці роўныя і цар, і жабрак.

Адзначаны вышэй дэмакратызм беларускага асветніка не мог не паўплываць на характар прынцыпаў маральнага выхавання, якія ён распрацоўваў. Маральна дасканалы чалавек у яго разуменні — гэта прыхільнік простых людзей, іх

абаронца і дарадчык. Сімяон прапаведаваў любоў да абяздоленых, убогіх. Ён імкнуўся не толькі выклікаць спачуванне да простых людзей, але і паказаць веліч, мудрасць, гераізм апошніх. Паводле перакананняў іераманаха, нават цар можа быць абраны з нязнатнага роду.

Сімяон Полацкі, гэтак жа як і Ф. Скарына і яго паслядоўнікі, галоўным лічыў выхаванне ў дзяцей пачуцця любові — любові да бліжняга, да чалавека наогул, любові да навакольнага асяроддзя, да прыроды, да жыцця.

Высока цаніў Сімяон такія якасці, як смеласць і мужнасць. Вянцом маральнасці чалавека лічыў ён сумленнасць, праўдзівасць: "Слово праведно тщится глаголати, лживаго паки никогда вещати". Выключна важную ўвагу ўдзяляў Сімяон Полацкі выхаванню працавітасці, рэкамендаваў "берагчыся ад гультайства, бо то ёсць маці прывыкання да зла". Цар і той павінен умець выконваць любую работу і быць прыкладам працавітасці для падначаленых.

Маральна дасканаламу чалавеку, на думку Сімяона Полацкага, абавязкова павінны быць уласцівы такія якасці, як памяркоўнасць, разважлівасць, пачуццё меры. Будучы перакананым паборнікам строгага, ухваляемага рэлігіяй спосабу жыцця, ён тым не менш папярэджваў заўзятых выканаўцаў культавых абрадаў: "Пост безмерный силу истребляет, дух уныньа и печаль раждает".

Да адной з самых распаўсюджаных заган у людзях Сімяон адносіў срэбралюбства. Ён перасцерагаў, што гэтая якасць валодае магутнай разбуральнай сілай. Назіральнае вока паэта прыкмеціла, што багаты чалавек часта губляе асновы чалавечнасці — міласэрнасць, спагадлівасць, любоў да бліжняга.

Сімяон быў перакананы, што перадумовай маральнага выхавання павінна быць развіццё і ўдасканаленне розуму. Зыходзячы з гэтага прынцыпу, ён велізарнае значэнне надаваў школьнай адукацыі і нават асмеліўся даць цару прамую параду клапаціцца аб асвеце падданых: "Мало есть правды царю мудру быти, а подчиненных мудрости лишити". Асветнік лічыў місію настаўніка-выхавальніка надзвычай важнай і высакароднай, але папярэджваў, што гэта вельмі складаная і цяжкая прафесія. У адным з яго рукапісных чарнавікоў знойдзены такі фрагмент трактата аб настаўніках: "Собирай яко пчела мед сладкий, презирай еже неполезно, отемли пшеницу чистую, оставляя плевелы и куколы". Верачы ў сілу выхаваўчага ўздзеяння на чалавека, Сімяон заўважае, што так, як садоўнік вінен у крывізне дрэва, так і выхавальнік нясе адказнасць за "злонравие" дзяцей. Ён лічыў важнейшым прынцыпам выхавання адпаведнасць слоў справам. Настаўнік сам павінен рабіць тое, чаму вучыць іншых, у адваротным выпадку ён не здолее дасягнуць станоўчых вынікаў.

Надаючы вялікае значэнне школе ў маральным выхаванні, Сімяон усё ж сцвярджаў, што менавіта сям'я з яе ўкладам і традыцыямі з'яўляецца асноўным фарміруючым звяном душы дзіцяці.

Філосаф-педагог закранаў пытанні фізічнага выхавання і ўзаемаадносін яго з маральным: "Плоти изнемогшей ум недобр бывает".

Уяўляе цікавасць імкненне Сімяона вызначыць асноўны змест выхавання па ўзросту дзяцей. Ён падзяляў працэс выхавання на тры сямігадовыя перыяды. У першыя сем гадоў ён раіў развіваць у дзіцяці такія якасці, як праўдзівасць, руплівасць і акуратнасць. У другую "седмицу" падлетка патрэбна ўжо навучаць якому-небудзь рамяству. У апошні перыяд — з 14 да 21 года — юнак павінен мець "добры розум, страх божы і прамудрасць".

Як бачым, у адрозненне ад перыядызацыі заходнееўрапейскага педагога Ж. Ж. Русо, які прапаноўваў маральным выхаваннем займацца з 16 гадоў, Сімяон лічыў, што пачынаць гэта трэба як мага раней, "от материнской груди". Ён адзначаў, што маральныя якасці, выхаваныя з ранняга дзяцінства, захоўваюцца на ўсё жыццё.

Сімяон Полацкі не адрываў працэс маральнага выхавання ад рэальнага жыцця, а, наадварот, цесна ўвязваў яго з існаваўшай рэчаіснасцю. Ён разумеў, што дзеці нярэдка будуць сустракацца і з маральнымі заганамі, і са злымі норавамі. Асветнік рэкамендаваў бацькам і выхавальнікам засцерагаць дзяцей ад дрэнных сяброў і арыентаваць іх "на общение с добрыми", бо "ходящий с премудрым будет сам премудр". Аднак такое ахоўванне падлеткаў не зводзілася да ізаляцыі дзіцяці ад знешняга свету, як, напрыклад, у шырока вядомых падыходах Ж. Ж. Русо. Айчынны педагог улічваў грамадскую прыроду чалавека і разумеў, што "только в содружестве жительствующий" можа стаць годным грамадзянінам.

Асоба Сімяона Полацкага, як і яго творчасць, — складаная і супярэчлівая. Выхаванец езуіцкага калегіума, носьбіт ідэй базыльянскага ордэна — і ў той жа час праваслаўны манах; прыхільнік шырокай асветы ўсіх людзей — і абаронца элітарнасці, прывілеяванасці адукацыі; пясняр магчымасцей, здольнасцей разняволенай асобы — і прапаведнік аўтарытарызму ў выхаванні, змагар з "ерассю". Аднак у цэлым уклад Сімяона Полацкага ў справу адукацыі быў такім важкім, што, па ацэнцы многіх сённяшніх вучоных, ён абагнаў тагачасную расійскую педагагічную думку на цэлае стагоддзе.

**В. С. БОЛБАС,**
**кандыдат педагагічных навук.**
г. Мазыр.

15. Пастухов А.И., Мосолов В.А. Формирование инженерно-педагогических кадров профессионально-технического образования: Профпедагогика. – М.: Высшая школа, 1981. – 135 с.
16. Программа реализации Концепции развития высшего образования в Республике Беларусь / Сб. концептуально-программных документов по развитию национальной системы образования / Министерство образования РБ / Под общ. ред. Г.Д. Дыляна. – Мн., 2001. – С. 125-137.
17. Программа развития профессионально-технического образования в Республике Беларусь / Сб. концептуально-программных документов по развитию национальной системы образования / Министерство образования РБ / Под общ. ред. Г.Д. Дыляна. – Мн., 2001. – С. 106-113.
18. Родин А.М. Подготовка педагогических кадров в РСФСР в 30-е годы: проблемы и трудности // Педагогика. – 1996. – № 3. – С. 93-97.
19. Тарифно-квалификационные характеристики должностей служащих учреждений и организаций здравоохранения, культуры, образования, физической культуры и спорта (Извлечение) – Мн., 1998. – 108 с.
20. Титок З.М. Высшая школа Беларуси (90-е гг. XIX ст.) / Педагогическое образование в классическом университете: проблемы и перспективы: Материалы международной научно-практической конференции, 12 октября 2000 г., Минск / Под ред. Н.А.Березовина. В 2-х ч. Ч. 2. – Мн.: БГУ, 2000. – С. 88-96.


# ИНЖЕНЕРНО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ МОЗЫРСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ПЕДАГОГИЧЕСКОГО УНИВЕРСИТЕТА: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ


**Болбас В.С.,**
*первый проректор Мозырского государственного педагогического университета, кандидат педагогических наук, доцент*
*т. 8-02351-2-50-61 (Мозырь)*


Стало уже свершившимся фактом получение Мозырским пединститутом, который был основан в 1944 году как учительский институт, статуса университета. Наш университет – педагогический, что предопределяет его научную и практическую направленность, будущую профессиональную деятельность выпускников. Перед коллективом регионального вуза стоит трудная задача: не просто совершенствовать имеющуюся научно-методическую и материальную базу, но создавать и постоянно поддерживать своеобразную ауру, дух университета. Как для любого высшего учебного заведения подобного типа, для Мозырского педагогического университета справедливы главные принципы университетского образования, сформулированные известным педагогом С.И. Гессеном:

- полнота представленного научного знания;
- дух свободы и творчества в процессе преподавания и обучения;
- способность университета к самовосполнению путем подготовки преподавателей и ученых;

Это, безусловно, долгосрочная задача, но уже сегодня можно говорить о том, что указанные направления четко прослеживаются в работе всех подразделений университета, в том числе инженерно-педагогического факультета, который является базовым в Республике Беларусь по подготовке инженеров-педагогов со специализациями “Машиностроение”, “Строительство”, “Агроинженерия”, “Экономика и управление”, и ежегодно выпускает около ста специалистов. Сегодня трудно поверить, что в 1969 году, когда на базе факультета общетехнических дисциплин и физики начали готовить учителей труда, процент специалистов этой категории с высшим образованием в школах республики составлял всего 10%. Не хватало педагогических кадров, мастеров производственного обучения и в технических училищах. Поэтому в 1976 году на базе института была начата подготовка студентов

по специальности: "Преподаватель общетехнических дисциплин и труда". В 1982 году был открыт факультет общетехнических дисциплин и труда. А в 1989 году, в результате различных реорганизаций и изменения концепций обучения, начал действовать инженерно-педагогический факультет. На разных этапах им руководили А.А. Худяков, Н.К. Щур, В.К. Пакштас, П.И. Савенок и другие.

С 1960 года подготовка инженеров-педагогов велась на базе Белорусского политехнического института (ныне Белорусский национальный технический университет). В этот период приоритетными считались инженерные знания, а педагогические – вспомогательными, помогающими молодому специалисту определить свое место в жизни. Но в 70-е годы акцент был сделан именно на педагогическую подготовку инженеров, чтобы удовлетворить потребность в мастерах производственного обучения, методистах, преподавателях общетехнических дисциплин. В 80-х годах и позже эта тенденция сохранилась, что и способствовало становлению инженерно-педагогического факультета в Моз. ГПИ им. Н.К. Крупской, укреплению его связей с ПТУ республики. Факультет в настоящее время сотрудничает с профессионально-техническими училищами №131, №228 г. Мозыря, ВТУ г. Минска и г. - Гомеля, Минским и Пинским индустриально-педагогическими колледжами. Подготовка кадров высшей квалификации для системы профессионального образования является основным направлением работы факультета. С 1995 года в рамках учебного научно-методического объединения "Мозырский госпединститут – Минский и Пинский инженерно-педагогический колледжи" ведется подготовка студентов в системе непрерывного образования по специализации "Строительство". Выпускники этих колледжей также обучаются заочно на факультете ИПФ по сокращенным срокам обучения. Такая практика положительно оценивается специалистами и подтверждает, что перспективы развития профессионального образования связаны с интеграцией среднего профессионального образования с высшим.

Факультет гордится своими выпускниками, которые работают не только в Республике Беларусь, но и во многих государствах СНГ, в странах дальнего зарубежья. Это О.Е. Лисейчиков – зам. директора Национального института образования Республики Беларусь; В.С. Шуляковский – директор ПТУ-31 г. Минска; Н.Д. Вергейчик, В.И. Кабанов – заместители генерального директора Минского Высшего профессионально-технического училища №230; М.Е. Разумец – заместитель директора Пинского индустриально-педагогического колледжа и др. Многие выпускники остались работать на факультете: В.П. Дубодел, А.Р. Литовский, С.Ф. Селицкий, А.В. Кураш, А.В. Макаренко.

Ряд выпускников ИПФ после окончания университета продолжают свое обучение в различных вузах. Щемеров О.В. учится в Академии Управления при Президенте Республики Беларусь, Бондарев С.В. в Ирландском Университете г. Ольстер, БелыйИ.Л. в Белоруском национальном техническом университете и т. д. Студенты инженерно-педагогического факультета вместе с преподавателями активно принимают участие в научно-исследовательской работе. Защищают дипломные проекты, включающие результаты научно-исследовательской кафедральной темы. Лучшие студенческие научно-исследовательские работы постоянно участвуют в республиканских конкурсах.

Наши ученые активно обмениваются опытом работы с другими научными коллективами. В университет приглашаются читать лекции лучшие специалисты в технических областях знаний, работающие в вузах г. Минска, г. Гомеля. Так, читают лекции, руководят курсовыми и дипломными проектами профессора Ю.Д. Золотухин и И.А. Кудрявцев, доцент О.Е. Пантюхов из Гомеля, профессора из Национального института образования, Б.В. Паль-

чевский, В.В. Чечет и М.А. Кремень, доценты И.А. Барейша, Г.Я. Беляев и другие ученые из Белорусского национального технического университета.

На базе факультета проводятся Международные научно-практические конференции. В 1996 году была проведена научно-практическая конференция: "Проблемы непрерывной многоуровневой подготовки инженеров-педагогов", в работе которой приняли участие ведущие специалисты и ученые Республики Беларусь, России, Украины, Прибалтики, Польши, Словакии и других стран.

В 1998 году факультетом было организовано и проведено совещание по модульному обучению. В его работе приняли участие специалисты Министерства труда Республики Беларусь, Республиканского центра модульного обучения, руководители областного и Мозырского центров занятости населения, профессионально-технических училищ. В работе совещания участвовал старший советник МОТ по профессиональному обучению господин В. Дюрр (Швейцария). В результате совещания при факультете создан Региональный центр развития модульного обучения. Региональным центром Модульного обучения организуются семинары по подготовке специалистов по модульному обучению.

В 2000 году была проведена международная научно-практическая конференция "Профессионально-педагогические аспекты подготовки строителей и преподавателей строительных дисциплин в современных условиях".

В Гомельской области остро стоит проблема создания новых рабочих мест. Возникла необходимость быстрого обучения кадров, в соответствии с требованиями рынка труда, в связи с чем на базе инженерно-педагогического факультета в 1999 году открылся центр по подготовке, переподготовке и повышению квалификации специалистов.

Важными составляющими современного подхода к организации профессионального образования являются идеи гуманизации и гуманитаризации обучения, а также многоуровневая система подготовки кадров, которая предполагает не только получение высшего образования, но и степеней магистра и бакалавра соответствующих наук. Это позволит студентам на основе полученных универсальных знаний выбрать сферу профессиональной деятельности, которая бы зависела не только от социального заказа, но и обеспечивала бы свободу выбора, самореализацию личности. При обучении будущих инженеров-педагогов, кроме традиционных средств обучения, используются и новые его виды: модульное и программированное обучение. Современный учебный процесс немыслим без компьютера. Опираясь на современные методы обучения, и, конечно, самостоятельную работу студентов, перед коллективом профессорско-преподавательского состава стоит задача дать выпускнику универсальное высшее образование, не в ущерб профессиональному и педагогическому. Этому содействует изучение не только узкопрофессиональных дисциплин, связанных со строительством или обработкой металлов, но и гуманитарных, социально-экономических, общеобразовательных, общенаучных и психолого-педагогических дисциплин, прохождение производственных и педагогических практик.

Исторически сложились две модели университетского образования: традиционная, или классическая, и рационалистическая. Первая была направлена на получение универсальных знаний о мире, подготовку философов и богословов. Рационалистическая модель нацеливает на успешную адаптацию в современном обществе, глубокую специализацию будущей профессии, готовность к творческому освоению и разработке перспективных технологий. Соединить достоинство этих моделей в современном педагогическом образовании, конкретно – обучении инженеров-педагогов, безусловно, трудно, но именно такой подход способен обеспечить успех коллективу инженерно-педагогического факульета.